
ЗГОДА

ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ ШТОТЫДНЁВІК
http://www.zgoda-weekly.org

№ 33 (306) 20 — 27 верасня 2003 г.

ОКНО В ЕВРОПУ

ПАСЕ: учиться, учиться и учиться



НАШ ВЕРНИСАЖ. «Белорусская крыша *IBB*», художник СДВИЖКОВ-КЛИПАРТНЫЙ

АЛЕСЯ ГОРДИНА

ПАСЕ пока не может дать ответ на просьбу Палаты представителей о возобновлении статуса специально приглашенного. Об этом международные парламентарии заявили на пресс-конференции по итогам своей поездки в Беларусь.

Основная цель нынешнего визита европейских депутатов была более чем тривиальная. В энный раз представители международного сообщества пытались демократизировать нынешний режим. Специально для белорусских парламентариев был организован семинар «О функционировании и опыте совершенствования демократических институтов современного государства». Такого рода мероприятие проводится не впервые. О том, насколько успешны потуги международных посланников, можно судить хотя бы по тому, что они дипломатично ушли от ответов на вопрос, улучшилась или ухудшилась политическая ситуация в Беларуси. Члены делегации отсылали журналистов к отчету о своей поездке, который они представят бюро Парламентской ассамблеи после своего возвращения. Тем не менее удалось узнать, что вопрос о правах человека в Беларуси европейские парламентарии все же будут поднимать наряду с аналогичными проблемами в других странах.

Мораторий на смертную казнь – одно из главных условий для рассмотрения вопроса о возврате статуса Беларуси в ПАСЕ. Примечательно, что вторым по значимости условием руководитель делегации ПАСЕ Ренате Волвенд назвала проблему исчезнувших оппонентов режима. Белорусские власти должны предоставить сведения, что они предпринимают по выяснению судеб пропавших. Достигнута договоренность, что министр иностранных дел Мартынов будет исполнять роль посредника между прокуратурой Беларуси и комиссией Сергея Ковалева, занимающейся исчезнувшими в нашей стране. Через Мартынова ПАСЕ попытается наладить связь с властями, чтобы выяснить тайну исчезновения известных белорусских политиков.

Прочие критерии, которые выдвинули международные парламентарии – свобода СМИ, общественных и политических объединений и изменения в избирательном законодательстве. Члена делегации Микко Ело поразило количество предупреждений министерства информации – десятки, вынесенные негосударственным СМИ за этот год. «*У нас в Финляндии дело обстоит наоборот*, – отметил депутат. – *Газеты предупреждают нас, политиков. И наш президент, премьер-министр, члены парламента часто критикуются СМИ. Единства не добиваются путем борьбы с неугодными. Его устанавливают путем диалога*».

Александр Малаховски обратил внимание на отсутствие оппозиции в парламенте. «*Все европейские страны имеют крепкую оппозицию*, – отметил польский депутат. – *В Беларуси оппозиции нет вообще. Демократическая страна без оппозиции – это что-то удивительное. Может быть, оппозиция – очень трудная проблема для руководителей государства, но необходимая*».

Йонас Чекуолис охарактеризовал избирательный закон в Беларуси как «*красиво и хорошо читаемый*», однако не воплощаемый в реальной жизни. «*То, как он воплощался до сих пор, и объясняет, почему получается так, что выборы в Республике Беларусь международными организациями, в том числе и Советом Европы, признавались как некорректные и плохие*, – заявил литовский депутат. – *Вы знаете, о чем я говорю*».

Те, кому довелось присутствовать на семинаре, где белорусских депутатов учили демократии, подметили любопытную особенность. Выступления палаточников строились по идентичному сценарию. Во вступительной части они давали общую характеристику вопроса, затем говорили о процветании демократии в Беларуси, а в заключение просили вернуть палате статус специально приглашенного в ПАСЕ. Как выяснилось, такая закономерность возникла отнюдь не спонтанно. Руководство Национального собрания подготовило для своих участников инструкцию именно с такой последовательностью выступления.

В ходе визита делегация ПАСЕ встретилась с министрами иностранных дел и печати, а также посетила администрацию президента. «*Нам в ходе семинара и в ходе наших встреч было сказано очень много правды о Беларуси. Но мы также хотели бы услышать и мнение другой стороны*», – заявила госпожа Волвенд накануне встречи с руководителями оппозиционных партий и неправительственных организаций. От них международные парламентарии услышали другую правду – о масштабной ликвидации третьего сектора, репрессиях против негосударственных СМИ и прочих особенностях демократии по-белорусски. Лидер БНФ Винцук Вячорка передал также обращение родителей учащихся белорусского гуманитарного лицея, закрытого властями. Члены делегации ПАСЕ встретились с лицеистами и учителями, посетили помещения, где в полуподпольных условиях занимаются дети. Европейские парламентарии расценили ситуацию с белорусскоязычным лицеем как ненормальную и как вопиющее нарушение прав человека. Этот факт будет отражен в отчете делегации ПАСЕ, который вскоре представят в Страсбурге.

Проблема возвращения лукашенковской Беларуси статуса специально приглашенного гостя ПАСЕ будет дискутироваться на очередном заседании бюро Парламентской ассамблеи. Однако европейские парламентарии заявили, что решить этот вопрос «*в короткий промежуток времени*» едва ли будет возможно. Что же касается присоединения Беларуси к ЕС, то такая перспектива даже еще не обсуждалась. «*Это будет не завтра и не послезавтра*», – прозвучало на пресс-конференции. Так что белорусским палаточникам, как завещал революционный вождь, еще учиться, учиться и учиться на семинарах ПАСЕ.

■

19 ВЕРАСНЯ

Дзень зачыненны газет

Дзень салідарнасці з беларускімі журналістамі аб'яднае прадстаўнікоў масс-медыя 19 верасня.

Беларускаму рэпарцёрскаму цэху іншага не выпадае, як узгадаць сарканстычнае: лепшы спосаб адзначыць свята – засяродзіцца на недахопах. Недахоп у нас цяжкі і гругвасткі – не стала волі. Свабоды. Разнастайнасці. Развіцця.

Днём зачыненых газет адзначаюць гэтую дату сябры Беларускай асацыяцыі журналістаў.

Шмат цікавых і патрэбных чытачу незалежных выданняў вымушана прыпыніла выхад, а тыя, што друкуюцца, пакутуюць ад несвабоды. Змагаюцца з адміністратыўным ціскам і судовымі разборкамі, эканамічным нераўнапраўем і прывідам цэнзуры, які на нашай частцы Еўропы не проста бадзяецца, а ўжо пануе. Чытачу не стае інфармацыі, журналістам зачыняюць дарогу да чытачоў.

Наш адказ – АДКРЫТАЯ ГАЗЕТА.

Нас вельмі намагаюцца раз'яднаць. На тое не шкадуюць ні слоў, ні грошай, ні сілаў. Дайшло да абсурду: замест вынішчаных сродкаў масавай інфармацыі плодзяцца палітінфарматары, замест свабодных у выбары тэм газетаў, тэлебачання, радыё – фанерныя стэнды ў вестыбюлях установаў ды на заводскіх прахадных, дзе кнопкамі прышпіленыя выразаныя з «*правільных*» газет ідэалагічна важныя артыкулы.

Наш пратэст – АДКРЫТАЯ ГАЗЕТА.

Дзень салідарнасці журналістаў у нашых цяперашніх абставінах – гэта заклік да еднасці і ўзаемападтрымкі. Усе мы – чытачы і «пісьменнікі», гледачы і рэпарцёры – сучаснікі і суайчыннікі. Усе мы вартыя годнага жыцця і не вартыя цемрашальства. Кожны з нас робіць сваю справу – і мы паважам адно аднаго за зробленае якасна, на карысць, дзеля развіцця. Абмежаванне свабоды слова, уладны ціск на незалежныя СМІ – гэта не толькі замах на існасць журналісцкай прафесіі, гэта знявага нашых агульных грамадскіх патрэбаў, мажлівасцяў, памкненняў.

Наша выйсце – АДКРЫТАЯ ГАЗЕТА!

АДКРЫТАЯ ГАЗЕТА
OPEN NEWSPAPER
ОТКРЫТАЯ ГАЗЕТА

19 ВЕРАСНЯ

Былое і думкі

ГЕНАДЗЬ СУДНІК,
былы рэдактар былога «Тыднёвіка Магілёўскага»

Газеты ў нашай краіне знікаюць не толькі па судовых выроках. «Тыднёвік магілёўскі» напрыканцы мінулага года вымушаны быў на шостым годзе жыцця спыніцца па фінансавых прычынах.

Намаганнямі абласнога ідэалагічнага штабу і ў поўнай адпаведнасці з генеральнай кіруючай лініяй магілёўскія праблемы не трапляюць пад грамадскую ўвагу і абмеркаванне. Мясцовыя выданні старанна цвердзяць пра паспяховы рух наперад і нібыта грамадскую згоду.

Практыкі замоўчвання рэалій жыцця не могуць змяніць новыя дэпутаты «ад дэмакратычнай плыні», якія ў надзвычайны выбарчай кампаніі шмат каго і нават сябе здолелі пераканаць у магчымасці падняць аўтарытэт мясцовых саветаў і гатоўнасці перахапіць ініцыятыву ў выканаўчых структураў. Надзеі, аднак, аказаліся марнымі, а здольнасці перабольшанымі.

Сёлета рэгіён святкаваў 65-годзе сваёй адміністратыўна-тэрытарыяльнай цэласнасці. Сапраўды, толькі гэты караценькі перыяд з свайго шматвяковага ўзросту рэгіён жыве ў межах адной (роднай) краіны, якая і сама набыла незалежнасць зусім нядаўна. Можа, з-за гэтых тэрмінаў афіцыйнае начальства яшчэ не навучылася карыстацца адпаведнай тэрміналогіяй, і ўсё святкаванне юбілею вобласці мела савецкую ўзнёслую інтанацыю.

Ніякіх узгадак пра дасавецкую гісторыю рэгіёну ні з прамоўчых трыбунаў, ні са старонак мясцовых газетаў не гучала. Не ўзгадвалася і пра тое, што па выніках эканомікі і шмат якіх іншых паказчыках Магілёўшчына, як ні стараецца (асабліва ў апошнія 3-4 гады аблвыканкамаўскага старшынства Барыса Батуры), па-ранейшаму займае апошнія месцы ў краіне. Яна дае восьмую частку прамысловай прадукцыі краіны і сёмую – сельскагаспадарчай.

Заканчэнне на стар. 3 ➲

АНЕКДОТ-С

– Что будет, если белорусского президента вызвать на допрос в КГБ?

– Хорошие отношения с Россией.

***

У белорусского президента на пресс-конференции спрашивают, когда, по его мнению, российский рубль станет единственным платежным средством в стране.

– Мое мнение, что никогда, но я с ним не согласен.

НАВІНЫ

ІНЦЫДЭНТ. Падчас наведвання спікерам Дзяржаўнай думы Расіі, старшынёй Парламенцкага сходу саюза РБ і РФ Генадзем Селязнёвым 16 верасня ў Магілёве Беларуска-расійскага універсітэта адбыўся інцыдэнт. Калі госці былі ў зале універсітэта, адзін са студэнтаў ВНУ, знаходзячыся ў нецвярозым стане, выкраў «БМВ-525» – галаўную машыну міліцэйскага суправаджэння картэжа спікера Дзярждумы. За зламыснікам была арганізаваная пагоня. Спыніць яго ўдалося на тэрыторыі горада. Пры гэтым БМВ сутыкнуўся з аўтамабілем «Ніва». У выніку дарожна-транспартнага здарэння ніхто не пацярпеў. Студэнт затрыманы. У адносінах да яго распачата крымінальная справа па артыкулу 214 (выкраданне аўтадарожнага транспартнага сродку), што прадугледжвае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам ад 5 да 7 гадоў.

ВАЛЮТА. Увядзенне адзінай валюты эканамічна больш выгадна Беларусі, чым Расіі – такое меркаванне выказаў 16 верасня першы намеснік міністра фінансаў Аляксей Улюкаеў. *«Для Расіі гэта будзе амаль неадчувальна. Маштабы несупастаўныя»*, – сказаў Улюкаеў. Пры гэтым ён паведаміў, што ВУП Беларусі складае толькі 3 працэнты ад ВУП Расіі, і ўсё, што адбываецца ў эканоміцы Беларусі, адлюстроўваецца на Расіі ў такіх суадносінах. Беларусь, у сваю чаргу, атрымлівае моцны плацёжны сродак у выглядзе расійскага рубля і шансы на аздараўленне бюджэту і зніжэнне інфляцыі, падкрэсліў Улюкаеў. Зараз, нагадаў ён, рост цэн у Беларусі складае 24 адсоткі, што ўдвая больш за пакасчык інфляцыі ў Расіі.

СВЯТА. З кастрычніка, у пятніцу, у сувязі са святкаваннем нацыянальнага свята ФРГ – Дня германскага адзінства – візавы аддзел нямецкага пасольства ў Мінску (вуліца Будзёнага, 10) будзе закрыты для наведвальнікаў. 13 гадоў таму, у 1990 годзе, нагадвае прэс-служба пасольства ФРГ, *«пасля дзесяцігоддзяў раздзелу Германія – са згоды ўсіх яе суседзяў – зноў набыла сваё дзяржаўнае адзінства»*. Як патлумачылі ў дыппрадстаўніцтве, паколькі супрацоўнікі пасольства ў Мінску таксама будуць адзначаць гэтае свята, візавы аддзел у гэты дзень працаваць не будзе.

ІНТЭГРАЦЫЯ. Працэс інтэграцыі дзвюх дзяржаў развіваецца няпроста, заявіў, на адкрыцці сесіі Парламенцкага сходу саюза Беларусі і Расіі старшыня расійскай Дзярждумы Генадзь Селязнёў. *«Глыбінныя прычыны існых цяжкасцей абумоўлены шэрагам аб'ектыўных прычын і суб'ектыўных фактараў*, – заявіў ён. – *Да таго ж у працэс станаўлення і развіцця нашага саюза па-ранейшаму шмат уплывовых працўнікаў у свеце. На Захадзе даўно і адкрыта не ўтойваюць сваёй асцярогі наконт пабудовы новага моцнага геапалітычнага ўтварэння на постсавецкай прасторы. У дэструктыўных мэтах падтрымліваюцца тыя сілы і ў Беларусі, і ў Расіі, якія выступаюць супраць аб'яднання брацкіх народаў»*. *«З горыччу»*, паводле слоў спікера Селязнёва, даводзіцца канстатаваць, што на сённяшні дзень не вырашаны асноўныя стратэгічныя задачы саюзнага будаўніцтва – няма рашэння па праекце канстытуцыйнага акта і правядзенні выбараў у парламент саюзнай дзяржавы, а таксама няма валютнага саюза. *«Усе разумеюць, што паспяховае вырашэнне гэтых задач магло б даць другое дыханне саюзнаму будаўніцтву. Менавіта таму мы адчуваем у гэтых сферах найбольш моцнае супраціўдзеянне з боку працўнікаў інтэграцыі»*, – сказаў ён.

ЛІЦЭЙ. Пачаўся працэс вяртання абсталявання і літаратуры калектыву Нацыянальнага гуманітарнага ліцэя імя Якуба Коласа. Аб гэтым 15 верасня заявіў заснавальнік і кіраўнік навучальнай установы Уладзімір Колас на бацькоўскім сходзе, які адбыўся ля зачыненых дзвярэй будынка ліцэя па вуліцы Кірава, 21 у Мінску. Дырэктар Колас нагадаў, што пасля выхаду пастановы ўрада аб ліквідацыі ліцэя ў будынку навучальнай установы засталася вялікая колькасць маёмасці, што перададзена ў дар ліцэістам рознымі ўстановамі і прыватнымі асобамі. *«Зараз улады пачалі працэс вяртання нам камп'ютэраў, вучэбнай і іншай літаратуры»*, – сказаў Уладзімір Колас. Паводле яго слоў, навучальны працэс у ствараемым недзяржаўным ліцэі ўваходзіць у нармальнае рэчышча. *«Адзіная праблема, што нас хвалюе, – гэта лёс будынка навучальнай установы па вуліцы Кірава, 21»*, – падкрэсліў кіраўнік ліцэя. Адначасова ён звярнуў вагу на неабходнасць прыстасавання для заняткаў памяшканняў, якія прадаставілі навучальнай установе арганізацыі і прыватныя асобы. Як зазначыў намеснік дырэктара па навучальнай частцы ліцэя Лявон Баршчэўскі, неабходна пашукаць пералік памяшканняў, дзе могуць праводзіцца вучэбныя заняткі. Ён выказаў спадзяванне, што ўсе асноўныя праблемы арганізацыі вучэбнага працэсу будуць вырашаныя на працягу верасня, і заявіў упэўнена, што іх дзецям *«яшчэ будуць зайздросціць равеснікі»*.

БУЛЬБА. У Лунінецкім раёне Брэсцкай вобласці мясцовыя ўлады ўзялі пад кантроль нарыхтоўку бульбы. Згодна з распараджэннем мясцовага райвыканкама, закупаць бульбу ў насельніцтва павінен райспажыўсаюз. Камерсантам рэкамендуецца праводзіць закупку не наўпрост, а праз пасрэдніка – райспажыўсаюз. Сёлета ў раёне чакаецца добры ўраджай бульбы. І цану на яго абвесцілі для прыватных нарыхтоўшчыкаў. Яны прапануюць плаціць па 200 рублёў за кілаграм. Першыя машыны з лунінецкай бульбай ужо пайшлі за межы раёна. Аналагічная карціна і ў Пінскім раёне. У Лунінцы вырашана наладзіць нарыхтоўку бульбы камерсантамі з іншых рэспублік выключна праз гандлёвую сетку раённага спажывецкага таварыства. На гэты конт ужо з'явілася распараджэнне райвыканкама. Стаіць задача зарабіць на гэтым грошы ў выглядзе падаткаў для мясцовага бюджэту, а таксама абараніць насельніцтва ад фальшывых грошай.

ГРОШЫ. 30 мільёнаў 570 тысяч рублёў выдаткавана дадаткова Інстытуту сацыяльна-палітычных даследаванняў (ІСПД) пры адміністрацыі прэзідэнта на падрыхтоўку і выданне навукова-тэхнічнай і навукова-метадычнай літаратуры (у тым ліку перыядычных выданняў). Грошы выдаткаваныя са сродкаў, прадугледжаных у рэспубліканскім бюджэце 2003 года на фінансаванне фундаментальных даследаванняў, навукова-тэхнічных праграмаў і праектаў у адпаведнасці з пастановай Рада міністраў № 1168 от 10 верасня. Гэтыя грошы плануецца накіраваць на выданне інфармацыйных бюлетэняў інстытута, традыцыйных зборнікаў працы ІСПД, а таксама матэрыялаў, падрыхтаваных паводле вынікаў сацыялагічных даследаванняў, у тым ліку маніторынгу сацыяльна-палітычнай сітуацыі ў Беларусі.

ХИТ-ПАРАД ГЛУПОСТИ




«Народное воодушевление и единодушие при строительстве Национальной библиотеки – следствие идеи, которая принимается всеми»

(М. Андрианов, «Рэспубліка», 17.09.03)



«Зарплату свою замы по идеологии отрабатывают – их рабочий день крайне напряженный, а выполняемые функции не дублируют обязанности других руководителей»

(Е. Прус, «Во славу Родины», 17.09.03)



«И сказал также, что если б Вы, Владимир Владимирович, вот так еще давлянули по Конституционному акту, то мы прекрасный бы Конституционный акт в ближайшее время смогли выработать»

(А. Лукашенко, «Народная газета», (18.09.03)

ТРЭЦІ СЭКТАР

Зачыняюць лепшых

АЛЕСЯ ГОРДЗІНА

Праваабарончы цэнтар «Вясна» — чарговая арганізацыя, якая падпала пад уладную кампанію знішчэння трэцяга сэктару. 13 верасня праваабарончы атрымалі зыскавую заяву Міністэрства юстыцыі аб ліквідацыі арганізацыі.

Сымбалічна, што прэс-канфэрэнцыя з гэтай нагоды праходзіла ў *«поўвайсковых умовах»*, як выказаўся кіраўнік «Вясны» Алесь Бяляцкі. У менскім офісе БНФ, дзе была прызначаная сустрэча з журналістамі, ледзьве ўдалося знайсьці невялічкі вольны пакойчык. У іншых займаліся сябры па няшчасьці – навучэнцы ліквідаванага ўладамі Нацыянальнага дзяржаўнага гуманітарнага ліцэю імя Якуба Коласа.

«Адбылося тое, што мы даўно чакалі», – адзначыў Алесь Бяляцкі. Ён зьвярнуў увагу на *«ўнікальнасьць зыску»*, які вынесены без папярэджаньняў. Спасылкі рабіліся адразу на грамадзянскі кодэкс, апэлюючы да якога Мінюст паставіў праваабарончую арганізацыю перад фактам закрыцьця. Цікава, што ў зыску няма ніводнага факту парушэньняў з боку «Вясны» за апошнія два гады. Усе прэтэнзіі да арганізацыі зьвязаныя з яе дзейнасцю з лета 1999 па восень 2001 году.

Дзіўны зьмест зыскавай заявы адзначыў і юрыст праваабарончай арганізацыі Валянцін Стэфановіч. Асноўнае, што «Вясьне» інкрымінуецца, – паданьне быццам бы несапраўдных дакумэнтаў пад час рэгістрацыі ў 1999 годзе. Валянцін Стэфановіч заўважыў, што на той час «Вясну» зарэгістравалі і да яе не ўзьнікла ніякіх пытаньняў. Хаця дакумэнты на рэгістрацыі знаходзіліся каля паўгада, і ўсе недахопы, на якія ўказалі рэгістрацыйныя ворганы, арганізацыя спраўна выправіла. Акрамя таго, штогод у «Вясьне» праходзілі праверкі.

Сапраўднымі прычынамі сваёй ліквідацыі праваабаронцы назвалі актыўную грамадзкую дзейнасьць арганізацыі, што выяўлялася ў крытыцы ўладаў у галіне правоў чалавека. «Вясна» штогод выдавала агляды-хронікі парушэньняў правоў чалавека, абараняла пацярпелых ад рэжыму людзей, брала ўдзел у назіраньні за выбарамі, пад час якіх зафіксавала шматлікія парушэньні.

Алесь Бяляцкі адзначыў, што ва ўладаў ёсьць план – план падрыхтоўкі да парламэнцкіх выбараў і да магчымага рэфэрэндуму. Частка гэтага плану – зьнішчэньне актыўных грамадзкіх арганізацыяў. Кіраўнік «Вясны» перакананы, што такі зыск, які атрымала «Вясна», не апошні ў адносінах да іншых арганізацыяў. Кампанія зачысткі будзе працягвацца.

Міністэрства юстыцыі, на думку праваабаронцаў, тут не крайняе. Гэта ня ёсьць яго ініцыятыва закрыцьця арганізацыі. *«Але тое, што зыск падпісаны міністрам юстыцыі Галаванавым, пацьвярджае – Мінюст фактычна выконвае ролю ката і, вобразна кажучы, у яго на сёньняшні дзень рукі па локаць у крыві ад грамадзкіх арганізацыяў, зь якімі расправіліся ў апошнія месяцы»*, – сказаў спадар Бяляцкі.

23 верасьня ў 10 гадзін раніцы ў Вярхоўным судзе адбудзецца сумоўе ісца і адказчыка з судзьдзёй. У выніку гэтай размовы і будзе вызначаная дата першага судовага паседжаньня па справе аб ліквідацыі Грамадзкага аб'яднаньня «Праваабарончы цэнтар «Вясна». Ілюзіяў наконт вырашэньня свайго лёсу праваабаронцы ня маюць. Але яны запэўнілі, што на закрыцьці іх праца не спыніцца, яны і надалей будуць дапамагаць ахвярам рэжыму і праводзіць маніторынг сытуацыі з правамі чалавека ў Беларусі.

«Пастаноўка пытаньня аб ліквідацыі нашай арганізацыі ў агульным кантэксьце тэрору, разьвязанага супраць няўрадавых арганізацыяў, гэта ёсьць пэўная адзнака нашай работы, – лічыць Алесь Бяляцкі. – *І я, з аднаго боку, кажу пра гэта з жалем і непакоем пра закрыцьцё арганізацыі. З другога боку, я ў нейкай ступені задаволены: таму што на сёньняшні дзень зачыняюць лепшых. Мы зараз атрымліваем дзясяткі званкоў падтрымкі як ад прадстаўнікоў іншых грамадзкіх арганізацыяў, так і ад нашых партнэраў з-за мяжы, і ад тых грамадзянаў, якім мы дапамагалі. І мы знойдзем магчымасьці і легальныя сродкі для працягу сваёй працы»*. ■

АБ'ЯВА

Пэрформанс

25 верасьня а шостай гадзіне ўвечары Скіргайла Паланэцкі прэзэнтуе свой пэрформанс.

«Вэрбальная магія яка развой культуры псыхічнае чыннасьці пераз вызуканьне Веля-Літоўскае мовы. З удзелам суполу й батлейнымі іімправізамі», – назваў пэрформанс аўтар.

Творца чакает ахвотных у актавай зале гістфаку БДУ (3-ці паверх), вул. Чырвонаармейская, 6.

ТРЕТИЙ СЕКТОР

Демократическое гетто

АЛЕСЯ ГОРДИНА

Международная хельсинкская федерация по правам человека и РОО «Белорусский хельсинкский комитет» приняли заявление с осуждением ликвидации «Правовой помощи населению».

8 сентября 2003 года судья Минского городского суда Наталья Жупикова приняла решение удовлетворить иск управления юстиции Минского горисполкома о ликвидации «Правовой помощи населению». Правозащитной организации инкриминировали незаконное оказание платных юридических услуг населению.

В «Правовой помощи населению» выдвинутые обвинения назвали абсурдными. Никаких доказательств, что организация оказывала платные услуги без соответствующей лицензии, заявил ее председатель Олег Волчек, органы юстиции так и не предоставили. Юридическая же помощь гражданам предусмотрена уставом организации. Среди основных причин, по которым закрыли правозащитную организацию, Олег Волчек назвал поиск исчезнувших оппонентов режима и помощь потерпевшим по вине властей в трагедии на Немиге.

МХФ и БХК расценили закрытие правозащитной организации как часть спланированной кампании против гражданского общества в Беларуси. «Правовая помощь» стала уже шестой негосударственной организацией, ликвидированной с нынешнего лета. И факты свидетельствуют, что не последней.

МХФ и БХК указывают также, что на фоне зачистки независимого от власти третьего сектора 1 августа Лукашенко издал указ «О республиканских государственно-общественных объединениях». Послушные режиму организации будут финансироваться правительством.

Декрет же президента № 13 от 15 апреля 2003 года, запрещающий общественным объединениям представлять интересы граждан в суде, является, по мнению правозащитников МХФ и БХК, еще одной попыткой превратить остатки гражданского общества Беларуси в *«демократическое гетто»*. ■

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

Маладзёвае пытаньне

ПРЭС-СЛУЖБА БНФ

17 верасьня адбылося чарговае паседжаньне кіраўнікоў пяці палітычных партыяў (АГП, БНФ, БСДГ, БПП, ПКБ), якія каардынуюць падрыхтоўку да выбараў і барацьбу супраць трэцяга прэзыдэнцкага тэрміну.

Галоўным пытаньнем сустрэчы апазыцыйнай «пяцёркі» была сустрэча з маладзёвымі арганізацыямі і ініцыятывамі. Таму ў сустрэчы ўдзельнічалі кіраўнікі Беларускай асацыяцыі маладых палітыкаў, Задзіночаньня беларускіх студэнтаў, «Зубра», ЛКСМБ, «Маладой грамады», Маладзёвага хрысьціянска-сацыяльнага саюзу, «Маладога фронту» й «Працоўнай моладзі».

Кіраўнікі партыяў паінфармавалі пра супольныя ініцыятывы «пяцёркі» аб стварэньні адзінага сьпісу на будучыя выбары й адзінага пасланьня. Маладзёвыя лідэры задалі партыйным кіраўнікам шмат пытаньняў, сярод якіх цэнтральным быў запыт пра здольнасьць палітычных партыяў трымаць інцыятыву, праяўляць волю і мужнасьць. Яны выклалі сваё бачаньне месца моладзі ў будучых палітычных і грамадзкіх кампаніях.

Моладзь не павінна быць абслугай чыіхсьці амбіцыяў. У сваю чаргу лідэры партыяў запэўнілі маладых калегаў, што разглядаюць іх як паважных партнэраў, і супольная стратэгія будзе распрацоўвацца супольна. Разам з тым палітычныя функцыі павінны быць за палітычнымі партыямі. У якой ступені моладзь гатовая ўдзельнічаць у будучых выбарчых кампаніях, а таксама ў кампаніі супрацьдзеяньня магчымаму рэфэрэндуму, залежыць ад самой моладзі.

Усе ўдзельнікі гаворкі пацьвердзілі, што падзяляюць агульныя каштоўнасьці дэмакратыі й незалежнасьці Беларусі. Дамоўлена надалей ладзіць сустрэчы з маладзёвымі лідэрамі штомесяц. Моладзь дамовілася яшчэ і пра асобнае спатканьне з мэтай абмеркаваць прапановы палітычных партыяў.

Нагадаем, што «пяцёрка» партыяў ужо правяла перамовы з групай «Рэспубліка», буйнымі агульнанацыянальнымі няўрадавымі арганізацыямі, а надалей плянуе спатканьне з кіраўнікамі ўсіх дэмакратычных прафсаюзаў. ■

ГЕНДЭРНЫЯ НАТАТКІ

Патрэба свабоды

ЮЛІЯ ДРАНЧУК

З відавочнай цяжкасцю перасоўваючы ногі, маладыя людзі — дзяўчына і хлопец гадоў 25–30, валакліся да выхаду з гастранома. Абняўшыся, па чарзе ікаючы, надзяляючы наваколле смярдзючым посталкагольным водарам і мацюкаючыся, яны прымушалі мінакоў абыходзіць іх як мага далей, наморшчыўшы насы. «Божухна, — да чаго ж яна дакацілася! Трэба ж гэтак набрацца!» — голасна абурылася на ўвесь буфет гандлярка, калі маладзёны былі амаль каля выхаду. «Чаму ты кажаш «яна»? Хіба ён за яе лепшы?» — адгукнулася касірка. «Дык на тое ён і мужык!» — у аргуменце адчувалася здзіўленне.

Нават не ведаю, каго крыўдзіць болей такое стаўленне да роляў мужчыны і жанчыны ў сусвеце? Мусіць, знойдзецца шмат мужчын, якія пагодзяцца з буфетчыцай, бо мяркуюць, што ім на лёсе напісана час ад часу набрацца гэтак, каб параўноўвалі з жывёлаю. Хоць жывёлы і не п'юць. А жанчына тым часам хай сядзіць у хаце, як кажуць, «за печкай», і гатуе вячэру. Гэта адзін з поглядаў.

Сустрэнуцца, пэўна, і тыя, хто наогул не п'е і іншым не дае. І для тых такое стаўленне было абразлівым. Знойдзецца яшчэ некалькі прамежкавых меркаванняў, але згаданы эпізд у шэраговым мінскім гастраноме па-навуковаму суха называецца «гендэрны стэрэатып».

Шмат хто кажа, што ў нашай краіне гэтак гістарычна склалася, што роля жанчыны – ахоўніца хатняга вогнішча і не больш за тое. А савецкая ўлада да гэтага гістарычнага вобразу дадала яшчэ і права (чытай абавязак) працаваць і зарабляць грошы. На мове Саветаў гэта называлася «роўнасць полаў» і «жаночая эмансіпацыя». На мове жыцця гэта выглядае як адказнасць жанчыны за ўсё – і за лад у хаце, і за дабрабыт сям'і. А менталітэт давяршае партрэт амаль святой кабеты, якая з бясконцай цярплівасцю здольна ўсё жыццё чакаць лепшай долі.

А як іншыя краіны? Як выглядаюць гендэрныя стэрэатыпы, роля жанчыны і мужчыны ў іншых краінах, якія таксама перажылі савецкія дзесяцігоддзі? Напаткаўшы на адным з міжнародных семінараў прадстаўніц Расіі, Грузіі і Кіргізіі, я скарысталася момантам і завяла сапраўдную жаночую гаворку.

МАЙА СІМАНІШВІЛІ.
ТЫФЛІС. СУПРАЦОЎНІЦА ПРЭС-СЛУЖБЫ МІНІСТЭРСТВА ІНФАРМАЦЫІ

– У Грузіі існуе культ жанчыны. Знешні. Няма такога свята, каб у гонар жанчыны не прамовілі сапраўдны грузінскі тост: прыгожы, вобразны і вельмі доўгі. Якога грузіна запытайся – ён табе абавязкова распавядзе, што папросту абагаўляе жанчыну, што яна і створана дзеля таго, каб яе на руках насілі. Але ж гэта словы, а вось як да справы, ва ўмовах сям'і... Тут усё істотнае, усё значнае. І справы, і рашэнні на плячах жанчыны.

Калі скончыўся сацыялізм, аказалася, што мужчынская псіхіка кепска прыстасоўваецца да жорсткага капіталізму і ягонай эканомікі. А жанчына тым часам – больш трывалая, цярплівая, моцная, практычная. Наогул, у нас лічыцца, што мужчына – істота больш тонкая і цікавая. А жанчына – прыземленая. Але ўсё гэта – цяпер. Роля жанчыны змянілася літаральна цягам дзесяцігоддзя. За савецкімі часамі ёй дазвалялася яшчэ менш, чым цяпер. Яна займалася гаспадаркай, выхоўвала дзяцей і не магла працаваць. Гэта была рэдкая з'ява – працоўная грузінка. Зрэдку трапляліся грузінкі, якія палілі.

Потым усё абвалілася адным махам. Асабліва пасля абхазскай вайны. Мужчыны раптам сталі страшэнна піць, а жанчыны зарабляць грошы: гандляваць на кірмашах, вазіць рэчы на продаж.

Я лічу, што ў нас развіваецца эмансіпацыя – жанчыны цяпер робяць не толькі тое, што ім дазваляюць мужчыны і традыцыі, але тое, што самі лічаць мэтазгодным. Прыкмета эмансіпацыі і ў тым, што наш парламант ачольвае жанчына, Ніно Бурджанадзэ. І яна вельмі папулярны палітык, бо, як кажуць, навяла парадак у парламенце, калі ўзначаліла яго.

Так што эмансіпацыя рухаецца наперад, хоць правы жанчын і мужчын яшчэ далёкія ад таго, каб быць роўнымі. Вельмі моцныя стэрэатыпы, якія насаджаліся стагоддзямі: мужчыны звыкла атаясамліваюць сябе з «гаспадаром» у доме. Самаўпэўненасці спрыяе дэмаграфічная сітуацыя: на 1 мужчыну 8 жанчын. Але я веру, што мы прыйдзем калі-небудзь да гендэрнай роўнасці. І роўнасць гэтая, на маю думку, будзе спрыяць агульнаму шчасцю грузінаў. Гармоніі мужчын і жанчын.

ГУЛЬНАРА АБДУЛДАЕВА.
БІШКЕК. ЖУРНАЛІСТКА ДЗЯРЖАЎНАГА РАДЫЁ

Гульнара лічыць, што кіргізы – вельмі працавіты, спагадлівы і памяркоўны народ. Яе азначэнні вельмі нагадвалі тое, што беларусы звычайна кажуць пра сябе, каб апраўдаць няздатнасць адстаяць свой лепшы лёс. У Бішкеку ўзімку няма электрычнасці. І цёпла бывае нечаста. Я падумала: праўду казаў наш «бацька» Лукашенка – не горай за ўсіх жывем, ёсць куды імкнуццца.

Гульнара мяне ўразіла. Неяк гутарылі пра алкаголь, чаму ён

Заканчэнне на стар. 6 ➲

19 ВЕРАСНЯ



Былое і думкі

➲ *Заканчэнне. Пачатак на стар. 1*

Але ў гэтым найменш вінаватыя насельнікі вобласці. Шмат у чым вінаватая тая самая гісторыя рэгіёну – і дасавецкая, і савецкая. Рэгіён застаўся адзіным у краіне, што не здолеў аднавіць колькасці насельніцтва, якое жыло тут перад другой сусветнай вайной.

Між тым, па савецкіх дырэктывах камандаваннем эканомікай у СССР, на тэрыторыі вобласці ў пасляваенны час з'явілася некалькі прамысловых гігантаў – «Хімвалакно», «Трансмаш», «Белшына». На забеспячэнне іх працоўнымі рэсурсамі і спецыялістамі рэгіён не меў уласных сілаў і чалавечых рэсурсаў. Адсюль перакосы і недарэчнасці ў нацыянальна-дэмаграфічным развіцці, а таксама неадольны цяжар па ўтрыманні індустрыяльных гігантаў, якія апошнімі гадамі па прычыне нерэфармаванасці ў адпаведнасці з патрэбамі рынку прыносяць рэгіёну толькі страты і сацыяльнае напружанне.

Практычна ўсе прадпрыемствы мясцовага ўзроўню – стратныя. Яны даўно не ведаюць тэхнічнага і тэхналагічнага абнаўлення і ніколі не чулі пра інвестыцыі, яны шпарка старэюць, як і натуральнае насельніцтва райцэнтраў і вёсак.

Моладзь бяжыць з роднага кута, як толькі атрымлівае пашпартную магчымасць. Нараджальнасць у вобласці практычна роўная смяротнасці. Большасць сем'яў распадаецца, не дацягнуўшы да 5-гадовага веку. Вёска вось-восьператворыцца ў чалавечую пустэчу...

Толькі ў самы апошні час пачаліся размовы і першасныя спробы рынкавага рэфармавання прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Аднак адміністравання тут настолькі шмат, што казаць пра эканамічную волю і чалавечую ініцыятыву пакуль не выпадае. Прыкладам, працоўным «Белшыны» не дазволена прыняць удзел у прыватызацыі прадпрыемства за маёмасныя чэкі, а «жывых» грошай у людзей няма. Значыць, гаспадарыць на «Белшыне» будуць не яны. Дзе ж тут маёмасная зацікаўленасць і пачуццё гаспадароў свайго дома?..

Няма гаспадароў і на вёсцы. Магілёўская вёска традыцыйна пакутуе ад нізкай энергатэхнічнай забяспечанасці, ад бясконцага камандавання над сабой, ад адсутнасці прыватнай зацікаўленасці ў выніках працы. Наш рэгіён, падаецца, лідзіруе ў перадачы памерлых калгасаў у склад тых, якія яшчэ трымаюцца на ўласных нагах. Гэтым утварэнням надаюцца новыя імёны і новыя эканоміка-вытворчыя шыльды. А шмат што застаецца па-старому – тое ж кіраванне, тая ж няпэўнасць прыватніцкіх асноў, тая ж селектарная нярвовасць падчас і сяўбы, і жніва.

Увесь час у стане напружання жывуць і працуюць прыватнікі. У гэтым найменшым (крыху больш за 6 адсоткаў ад усіх працуючых у вобласці) сектары эканомікі перыядычныя страйкі – звычайная з'ява. Страйкі даюць, праўду сказаць, мала плёну, бо ўлада не рэагуе на патрабаванні прыватнікаў, а грамадства дэманструе да іх (як і да шмат каго іншага – вось ці не асноўная праблема часу!) сваю поўную абыякавасць.

Самым залашчаным афіцыйнымі газетамі і тэлебачаннем першавераснёўскім сюжэтам стала адкрыццё ў абласным цэнтры расійска-беларускага ліцэю. Між тым ніводзін карэспандэнт з гэтых СМІ не накіраваўся ў Горкі, дзе дванаццацігадовая Марылька Каралькова разам з бацькамі працягвае няроўнае змаганне з дзяржаўнай машынай за сваё права вучыцца ў беларускай школцы. Куды там, калі ўся афіцыйная «культура» Магілёўшчыны грэбуе натуральнай задачай свайго развіцця на нацыянальным грунце. Затое, як днямі супакоіў абласную грамадскасць намеснік старшыні аблвыканкама А. Глаз, ёсць фінансавая гарантыя правядзення чарговага «Залатога шлягеру». Дый сумесны расійска-беларускі пленэр Бялыніцкага-Бірулі, які толькі прайшоў на Магілёўшчыне, заахвочваў мастакоў тэмай праслаўлення ці не адзінага (усё яшчэ) *Отечества.*

...І яшчэ шмат пра якія парадоксы можна даведацца з «Тыднёвіцкай» падшыўкі. А паколькі насамрэч яе няма, дык і жыццё шмат каму падаецца іншым. Тым больш, што ўлада ў сваім уменні ствараць уяўленне непараўнальна больш спрактыкаваная за любую газэту.

Днямі, напрыклад, у абласным цэнтры ўрачыста адчыненая пешая вуліца: адмысловыя ліхтары, брукаваная прастора, металёвыя (пад даўніну) лавы, крамы і буцікі на першых паверхах падфарбаваных дамоў. Усё бліскучыць і ззяе! Асабліва кранаюць новенькія, блакітнага колеру шыльдачкі на фасадах: «*улица Ленинская*». Вось яна – маштабная, салідная і яскравая пераемнасць, стабільнасць і перспектыва. Тое, чаго прагне стомленае грамадства і што паслядоўна забяспечвае рашучая ўлада...

А тут вы са сваімі «Пагонямі», «Салідарнасцямі» ды «Тыднёвікамі»... ■

19 СЕНТЯБРЯ

Воспоминание о будущем

СЕРГЕЙ ИВАНОВ, «БДГ»

Дурная весть пришла раньше, чем приказ министерства информации о приостановке выхода «Белорусской деловой газеты». То одному, то другому нашему журналисту доброжелатели сообщали, что дана команда закрывать «БДГ».

– Нет, что вы, – говорили нам в министерстве. – Никакой команды не было. Ну наказали мы вас, вынесли предупреждения, так прокуратура нас письмами просто завалила, уже невозможно не реагировать.

И действительно, даже в дурном сне не могло присниться, что газету могут закрыть. Ведь за что «Белорусская деловая» получила предупреждения Мининформа?

Сначала мы опубликовали материал с открытого судебного заседания, на котором наш журналист был официально аккредитован, по делу директора Минского тракторного завода Михаила Леонова. С обвинительной речью на нем выступил прокурор, затем с ответным словом Леонов. Оказывается, обвинительное заключение прокуратуры, в котором утверждается, что Леонов – вор, вор и еще раз вор, публиковать можно. А вот заявление Леонова о том, что его дело шито белыми нитками, – нельзя. Заявление Леонова – это, видите ли, материалы судебных слушаний, на их публикацию, оказывается, надо было испросить дополнительное разрешение судьи. А что, обвинительное заключение – это не материалы судебных слушаний? Бред какой-то! Тем не менее в публикации министерство усмотрело грубое нарушение закона о печати.

Второе предупреждение еще веселее. Мисс России Светлана Королева в интервью российской «Экспресс-газете» рассказала о своем пребывании в Беларуси, о том, как ей понравился президент Лукашенко, о том, насколько он галантный кавалер, что предложил красавице не уезжать вечером из Минска на поезде, а улететь на его самолете.

Мы по неопытности решили поинтересоваться, может ли Александр Лукашенко по личному усмотрению пользоваться лайнером главы государства, и провели блиц-опрос на эту тему. Кто-то говорил – может, кто-то говорил – не может, но дело не в этом. В самой постановке вопроса министерство информации усмотрело оскорбление главы государства, распространение порочащих сведений. Ни Светлана Королева, ни «Экспресс-газета» никого не опорочили и не оскорбили, а вот мы, поинтересовавшиеся мнением белорусов по этому поводу, оказались в списке злостных нарушителей закона о СМИ.

Приказ министра о приостановлении на три месяца выхода «Белорусской деловой газеты» не заставил себя ждать. Причем типографиям, почте и предприятиям системы «Союзпечать» его, судя по всему, зачитывали по телефону, поскольку приказ вступал в силу 29 мая, но уже 28 мая мы не смогли отпечатать газету.

С такими подходами закрыть «БДГ» или приостановить выход газеты можно было вчера и позавчера, можно будет завтра или послезавтра.

Самое загадочное в этой ситуации – истинная причина приостановки выхода «Белорусской деловой». Мы пытались выяснить ее в министерстве информации, а чиновники – у нас, ведь и нам, и им понятно, что цивилизованный путь решения любого конфликта со СМИ – это когда обиженный человек подает на газету иск в суд. И дальше уже суд выясняет, кто в данной ситуации прав, а кто нет, и выносит решение либо о штрафе для газеты, либо о публикации опровержения, либо о компенсации судебных затрат редакции особо нервным читателем. В нашей ситуации был применен иной способ – стремительный, эффективный и весьма болезненный. Почему?

Не поверите, но получилось как в том анекдоте: кто-то где-то кому-то что-то сказал, а глава государства маханул шашкой. Кто и где, мы уже знаем: о бизнесе этих людей из окружения Александра Лукашенко наша газета в последнее время писала много. Их интересы и на Белорусском металлургическом заводе, и в водочном бизнесе, и в торговле автомобилями.

В общем, как ни старайся, но невозможно не наступить на хвост «бизнесменам от государства». Они злились, нервничали, угрожали. Но никак не могли найти повод расправиться с газетой. А тут повод сам приплыл в руки.

– Кто написал эту мерзость? – вскричал глава государства, когда ему доложили о выходе в Москве книги «Нашествие. – Точной информации пока нет, но по предварительной... И были названы фамилии руководителей «БДГ». – Закрыть «БДГ»!

Эта версия произошедшего, рассказанная нам под большим секретом, наверное, наиболее близка к истине. Именно она объясняет то бешенство, с которым власть начинала бороться с «БДГ», и то обстоятельство, что спустя месяц процесс был пущен на самотек. Поскольку спецслужбы, конечно же, провели разбирательство и, естественно, выяснили, что никто из наших журналистов к написанию книги отношения не имел.

Но акцию расправы с «БДГ» власть решила превратить в кампанию запугивания всех независимых СМИ и полиграфистов. Наказаны издания, проявившие солидарность с газетой и предоставившие возможность журналистам «Белорусской деловой» печататься на своих страницах. Газете «Солидарность» выписали огромный штраф, газета «Эхо» закрыта, выход «Предпринимательской газеты» приостановлен, барановичскую «Местную газету» отказываются печатать типографии.

В общем, для нас всех лето оказалось горячим. Какой окажется осень? ■




ПОСТСОВЕТСКИЕ НОВОСТИ



Киргизия. В ответ на требование пророссийски настроенных депутатов киргизского парламента немедленно ликвидировать американскую авиабазу в столичном аэропорту «Манас» премьер-министр Николай Танаев заявил: *«Киргизская сторона пока не собирается поднимать вопрос об окончании срока пребывания в Киргизии ограниченного контингента сил антитеррористической коалиции в рамках операции «Несокрушимая свобода» в Афганистане. Сейчас не следует прекращать действие соглашения с силами антитеррористической коалиции, потому что военно-политическая обстановка в регионе свидетельствует о том, что реальная опасность со стороны Афганистана до сих пор существует»*. А строптивым парламентариям он напомнил, что *«в соглашении, ратифицированном в декабре 2001 года обеими палатами парламента республики, сказано, что если одна из сторон за 180 дней до окончания срока соглашения изъявит желание прекратить действие соглашения, то оно будет расторгнуто. Если этого не будет сделано, то соглашение автоматически пролонгируется на год»*.

Россия. Президент Путин подписал распоряжение, которым одобрил предложение правительства о заключении с Киргизией соглашения о статусе и условиях пребывания российской авиационной базы на территории Киргизии. В распоряжении, текст которого размещен 17 сентября на интернет-сайте главы российского государства, поручено Минобороны подписать указанное соглашение от имени Российской Федерации и в случае необходимости вносить в проект соглашения, одобренный правительством России, изменения и дополнения, не имеющие принципиального характера. Российскую военную базу планируется создать на аэродроме в киргизском городке Кант в 30 километрах от Бишкека.

Украина. На Украине оппозиция отметила 16 сентября третью годовщину исчезновения журналиста Георгия Гонгадзе. В центре Киева состоялся митинг, затем от площади Независимости до мемориальной доски погибшим журналистам на Крещатике выстроилась «живая цепь». Аналогичные акции прошли в большинстве областных центров Украины. Оппозиция обвиняет власти страны в причастности к исчезновению Гонгадзе, получившего известность благодаря интернет-публикациями с критикой в адрес правительства.



Россия. Глава Минэкономразвития Герман Греф сомневается, что соглашение о едином экономическом пространстве будет подписано в ходе саммита СНГ в Ялте. *«Пока, наверное, рановато говорить о подписании этого соглашения»*, – заявил Герман Греф в беседе с журналистами 15 сентября. В то же время российский министр отметил, что процесс создания единого экономического пространства между Россией, Казахстаном, Украиной и Беларусью *«идет нормально»*. По его оценке, переговорный процесс с Казахстаном находится в *«высокой степени согласованности»*, чуть больше проблем с Беларусью и Украиной.

Грузия. Грузинская делегация на предстоящем в Ялте саммите глав СНГ собирается сделать заявление о невыполнении соглашения, достигнутого в 1996 году президентами стран содружества по недопущению экономических контактов с абхазскими сепаратистскими властями. *«Поддержка этого заявления всеми президентами стран Содружества и определение ими своей позиции в отношении путей решения абхазской проблемы является приоритетным вопросом на саммите в Ялте для президента Эдуарда Шеварднадзе и грузинской делегации»*, заявил начальник бюро госканцелярии Грузии по делам СНГ Тимур Санадзе. По его словам, грузинская делегация *«зафиксирует свою позицию в отношении текста подготавливаемого заявления глав СНГ об углублении сотрудничества в экономической сфере»*, где по предложению российской стороны вносится запись, что страны СНГ стремятся к созданию единого экономического пространства. *«С такой формулировкой о создании единого, а не общего, экономического пространства грузинская сторона не согласна»*, подчеркнул Тимур Санадзе.

ПУТИ ДЕМОКРАТИИ

Без срока давности

ОЛЕГ ПЕТРОВ

30-летний юбилей пиночетовского переворота, по иронии судьбы также выпавший на 11 сентября, затмил вторую годовщину трагедии на Манхэттене.

11 сентября к посольствам Чили по всему миру потянулись люди со свечками и цветами. Парламенты многих стран, особенно там, где верховодят социалисты, приняли специальные обращения по этому поводу. В Париже мэр Дэланое открыл площадь, названную в честь чилийского президента, и объявил, что Сальвадор Аленде – *«один из самых великих представителей человечества и гуманизма»*.

Среди прочих достоинств Альенде социалисты выделяют его порой наивную веру в демократию. Несмотря на все трудности своего правления, он всегда был предан политической системе, где *«социалисты и христианские демократы дискутируют свободно»*. При Альенде оппозиция имела в своем распоряжении все средства выражения недовольства: независимую прессу, свободу собраний, легальную парламентскую оппозицию.

Немало шуму наделал выпущенный накануне в США сборник рассекреченных документов, где речь идет о деятельности ЦРУ по организации переворота под красноречивым названием «Дело Пиночета». По мнению социалистов, документы свидетельствуют, что ответственность за заговор против Альенде, а также переворот в Чили целиком лежит на администрации Никсона-Киссенджера, стремившейся предотвратить национализацию американской собственности в Чили.

Книга изобилует антиамериканскими ужасами. В ней повествуется, как в сферу деятельности ЦРУ в Чили входили организационная и финансовая поддержка оппозиционных групп, физическое устранение мешавших Пиночету политических деятелей, психологическая подготовка населения к смене власти. США задерживали выделенные Чили кредиты *World Bank* и *InterAmerican Bank*, они провоцировали забастовки фермеров и транспортников. Наконец, ЦРУ приступило к целой серии диверсий и терактов, целью которых было дестабилизировать обстановку в стране, заставить ее жителей поверить в необходимость введения жесткого военного режима.

Как бы там ни было, сразу же после переворота США организовали финансовую помощь режиму Пиночета. Америка посылала не только деньги – в Чили работала целая команда консультантов и советников, среди которых были и специалисты по организации репрессий против сторонников Альенде. Даже после того, как большинство стран осудили режим Пиночета и разорвали с ним дипломатические отношения, Америка активно пыталась интегрировать страну в мировую экономику.

Интересно, что американцы без особых споров единодушно покаялись за свою вину. По этому поводу было специальное заявление администрации. Тогда как в Чили до сих пор нет единства в подходе к сентябрьским событиям 1973 года.

Официальную часть юбилейных торжеств в Сантьяго организовывали бывшие жертвы Пиночета. С 1990 года у власти в Чили находится левоцентристская «Межпартийная концентрация за демократию», в которой первую скрипку играют социалисты. По результатам парламентских выборов 2001 года «Концентрации» принадлежат 62 из 120 мест в парламенте, что, однако, недостаточно для изменения конституции. Кроме того, в правительственную коалицию входят христианские демократы, ряд либеральных и левоцентристских групп.

